На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

№ 42 (1107)

Пятніца, 2 сакавіка 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 80 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

SOS!

Леонид СИНИЦЫН:

“Грабительскую приватизацию, которую Лукашенко в 1994 году обещал не допустить, он проводит теперь под давлением своего мафиозного окружения”

Леонид Георгиевич Синицын — один из тех, кто привел А.Лукашенко к власти. В свое время он возглавлял его избирательный штаб, а затем — Администрацию президента.

Леонид Георгиевич Синицын — один из первых, кто понял, что приход к власти А.Лукашенко сулит Беларуси большие страдания. Не согласившись с его безграмотной политикой, он оставил высокий пост и ушел из власти. Но, как гражданин, он озабочен судьбой страны, судьбой 10-миллионного народа. На днях он направил тревожные письма всем депутатам так называемой Палаты представителей Национального собрания Республики Беларуси. В них говорится:

“Политические игры, усилившиеся в год президентских выборов, грозят зайти слишком далеко. Одни кандидаты в президенты готовятся к предвыборным баталиям ради заморских грантов. Другой кандидат стремится распродать оставшуюся государственную собственность — лишь бы хватило денег на латание дыр и предвыборный подкуп избирателей. Идет чудовищное соревнование: кто дешевле продаст Беларусь.

Страна на грани небывалой по своим масштабам грабительской приватизации государственной собственности. Во власти активизировались те, кто боится потерять свое место после выборов. На продажу выставлены лучшие белорусские предприятия, чья эффективность зарекомендовала себя даже в условиях государственного управления. И если они и так работают эффективно, что получит народ после того, как эти, лучшие, предприятия будут проданы с молотка? Продав их, мы не станем богаче. Кто-то купит себе власть. А что делать остальным? Выпрашивать подачки у новых хозяев жизни?

Нужно сказать решительное “нет” приватизации в предвыборный год. Разговоры о том, что “если нет приватизации, нет и реформ”, накануне выборов могут вести только провокаторы. Грабительскую приватизацию, которую Лукашенко в 1994 году обещал не допустить, он проводит теперь под давлением своего мафиозного окружения.

Пока выборы не назначены, идет не реформирование экономики, а шулерская игра без правил, расцветает махровый беспредел.

Это необходимо прекратить. Пора вносить и принимать постановление Палаты представителей о назначении президентских выборов и вернуть всех в рамки закона. Вы и только вы вправе объявить их дату и остановить этим все преступные игры вокруг нашей Родины.

Пока вы будете ждать отмашки одного из кандидатов, все будет распродано. И тогда — какая, в принципе, разница, кто станет бесправным президентом ограбленного народа? Ведь наша страна будет принадлежать не нам!

Действиями доказывайте свою легитимность у себя в стране, а не только в Страсбурге, по-настоящему отстаивайте интересы народа и ничего не бойтесь.

Наше будущее, будущее наших детей и внуков — в Ваших руках".

Леонид Синицын бьет в колокола! Речь идет о том, что власть, прикрываясь демагогическими заявлениями о реформировании экономики, втихаря продает Беларусь российскому капиталу.

Молчать нельзя...

Антон КОРЗУН.

Шпионские страсти

Резонанснул...

Эх, тесно Александру Зимовскому в своей привычной воскресной телевизионной клетке, когда на голубых экранах выходит его программа “Рэзананс”. Решил “рэзанансніуть” Сашок не по плану — с неким экстренным выпуском в среду, сразу после программы “Панарама”. Анонс был мощный — сенсация, разоблачения, спешите видеть!.. А на деле? Серая антишпионская агитка в стиле “ТАСС уполномочен заявить”. Не хотелось бы, конечно, делать дополнительную рекламу программе, чей рейтинг оценивается в пределах 2%, и доводить его до цифры в 2,1%, но все же, видимо, придется — поскольку, увидев такое по БТ, волосы дыбом встают...

Зимовский открыто обвинил практически всю американскую миссию в Беларуси, включая работников Посольства США, ни много ни мало — в шпионской деятельности. Терминология времен холодной войны так и гремела с экранов — “происки ЦРУ”, “агентурная работа”, “явки”, “пароли”. По мнению Зимовского, у “американской шпионской миссии в Беларуси сегодня три направления деятельности — подготовка материалов, направленных на дискредитацию всех аспектов белорусской политики, мероприятия по искусственному созданию и эскалации политических и экономических противоречий между Беларусью и другими государствами, финансовая поддержка белорусских оппозиционных группировок и их лидеров, а также искусственное нагнетание сепаратистских настроений и межконфессиональных противоречий”. Боже, какая махровая лексика! В антигосударственной деятельности обвиняются буквально все — бывшие первые секретари американского посольства Тимоти Коэн и Серж Александров (причем последнего назвали “штатным сотрудником ЦРУ”), второй секретарь политико-экономического отдела посольства США в Беларуси Энтони Готфрид, цель пребывания которых в Беларуси, по Зимовскому, — агентурная деятельность и передача секретной информации. К примеру, как оказалось, “во время акций оппозиции Готфрид вел себя с вызывающей наглостью — шел во главе митингующей толпы с радиотелефоном в руке и раздавал указания фотокорреспондентам и телеоператорам, работающим на подконтрольные оппозиции СМИ, как создавать нужную Готфриду картинку”, “американский дипломат провоцировал столкновения участников акции с милицией”. И далее в том же стиле...

Я обратился в Посольство США с просьбой прокомментировать ситуацию, но ответа пока не получил: видимо, дипломаты переваривают сказанное Зимовским. А переварить такое быстро, прямо скажем, не так-то просто. Трудно сказать, насколько “срезонированные” с экрана очень серьезные обвинения соответствуют действительности: выяснить это — дело правоохранительных органов. Однако у меня, как у телезрителя, после просмотра такого напрашивается один вывод — властью начата ТЩАТЕЛЬНО РАЗРАБОТАННАЯ, ЦЕЛЕНАПРАВЛЕННАЯ кампания по дискредитации не только оппозиции, но и представительств зарубежных государств, и прежде всего Соединенных Штатов Америки. Цель кампании понятна — спровоцировать общество к сплочению вокруг Лукашенко в условиях МНИМОЙ внешней угрозы. А зачем нужно сплочение? Чтобы на выборах проголосовали правильно, с точки зрения стратегов Красного дома.

Александр СИЛИЧ.

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) праводзіць **у суботу 3 сакавіка 2001 г. а 15-й гадзіне ў Палацы мастацтва (вул.Казлова, 6, ст.метро “Плошча Перамогі”)** урачысты сход з нагоды дзесятай гадавіны Устаноўчага з’езда БСДГ і дзесяцігоддзя аднаўлення беларускай сацыял-дэмакратыі. Пасля афіцыйнай часткі — канцэрт барда **Алеся Камоцкага і гурта “Контрданс”.**

Уваход вольны, запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Возвращение к теме

Страсти вокруг памятника Евфросиньи Полоцкой



6 октября 2000 года “Народная воля” (№186) сообщила об открытии в древнем Полоцке памятника славной дочери белорусского народа преподобной Евфросиньи Полоцкой. По прошествии четырех месяцев газета возвращается к этому событию по весьма необычному обстоятельству: 28 февраля 2001 года руководящий орган Белорусского союза художников рассматривал вопрос об... исключении из своих рядов автора этого памятника Игоря Голубева.

Изгнать скульптора из БСХ вознамерились за невыполнение постановления Совета Министров № 1393 от 6 сентября 2000 года. Данным актом вводилось в действие Положение о порядке создания произведений монументального искусства на территории Республики Беларусь.

Рассуждать о художественной ценности монументальных произведений не берусь, поскольку сам я в состоянии лепить только геометрические фигуры. Другое дело — правовая оценка того или иного события по документам.

Началось все 26 января 2000 года, когда оргкомитет по установке в Полоцке скульптуры преподобной Евфросиньи принял решение воздвигнуть в городе памятник по проекту, предложенному скульптором И.Голубевым. И на основании данного решения уже через два дня с ним был заключен полагающийся в таких случаях договор при довольно жестких сроках изготовления.

Действия скульптора И.Голубева осуществлялись в строгом соответствии с уставом Белорусского союза художников, согласно которому (пункт 3.4) член БСХ имеет право:

— на свободу творчества;

— работать на основе договоренности и сдавать работу заказчику **без заключения** Художественного совета.

Безусловно, Евфросинья Полоцкая — историческая личность, значение которой для белорусского народа трудно переоценить. Но в данном случае памятник воздвигался по решению городских властей, а не правительства и, следовательно, эта монументальная скульптура статуса общегосударственной не имела. По всей видимости, это неправильно, но факт остается фактом: государство в лице правительства к данному произведению искусства оказалось непричастным.

Министерство культуры спохватилось лишь в апреле 2000 года и объявило конкурс на монумент, над которым скульптор И.Голубев в соответствии с договором работал уже три месяца. По условиям конкурса лучшие проекты планировалось направить в Полоцк для учета мнений горожан. Но...

Уже в середине мая без совета с полочанами минкультовское жюри назвало победителем скульптора А.Шомова. Однако Полоцк с данным решением не согласился, и 19 мая местная законодательная власть в лице городского Совета приняла решение об установлении скульптуры Е.Полоцкой именно по проекту Игоря Голубева. Уведомление о принятом решении за № 913-02/10 направили в Министерство культуры.

Торжественное открытие памятника состоялось 28 сентября 2000 года. А за шесть дней до этого в национальном реестре правовых актов (№88) опубликовано вышеупомянутое Постановление Совмина № 1393 о произведениях монументального искусства.

В соответствии с данным актом монументы воздвигаются на основании решения правительства и, **как правило**, на конкурсной основе. Напомню, что решения Совета министров на возведение в Полоцке памятника Е.Полоцкой не было. А вот сам монумент ко дню выхода постановления был уже установлен, и на объекте завершались отделочные работы.

Тем не менее коллеги по творчеству ополчились на Игоря Голубева.

Из протокола собрания секции скульптуры БСХ:

Повестка дня:

Обсуждение этического поведения скульптора И.В.Голубева и его профессиональной деятельности.

Зачитывается:

Постановление Совета министров по правилам установки памятников и заключение экспертного совета при Министерстве культуры по памятнику Евфросиньи Полоцкой, в котором дана отрицательная оценка сооружению и профессиональным качествам автора.

Постановили:

За деятельность, порочащую БСХ, выразившуюся в непрофессионализме и игнорировании профессиональной этики, повлекшие за собой дискредитацию образов деятелей белорусской истории и искусства **исключить** И.В.Голубева из Белорусского союза художников.

Данное решение подлежало утверждению на Раде БСХ, но при голосовании 28 февраля 2001 года не смогли набрать необходимых 2/3 голосов, и автору памятника Евфросиньи Полоцкой объявили... выговор.

Вот только за что?

Мой вопрос к членам Рады “А сумел бы воздвигнуть памятник по своему проекту победитель конкурса скульптор А.Шомов?” остался без ответа. А ведь вопрос был не праздный: в 1995 году А.Шомов уже побеждал в конкурсе на лучший проект монумента Евфросиньи Полоцкой, однако воздвигнуть памятник оказался не в состоянии.

Оценку монументу, полагаю, даст история. К примеру, В.Ленину монументы воздвигались тысячами, и все они получали одобрение художественных советов. Но сколько из них сегодня считается произведениями искусства — единицы.

Валерий ЩУКИН,

На снимке: *монумент, воздвигнутый в Полоцке по проекту И.Голубева.*

Свята: падпіска!

Працягваецца падпіска на “Народную волю”

“Народная воля” аб’яднала шырокавядомых публіцыстаў краіны і самых нераўнадушных чытачоў. Наша агульная мэта — незалежнасць Радзімы, шчасце народа.

Нашы аўтары:

— пісьменнікі **Васіль Быкаў, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Анатоль Казловіч** і многія іншыя;

— кінарэжысёр, публіцыст **Віктар Дашук;**

— філосаф-вучоны **Вячаслаў Оргіш;**

— юрыст-вучоны **Міхаіл Пастухоў;**

— эканамісты-навукоўцы **Уладзімір Кулажанка, Іван Нікітчанка, Барыс Жэліба;**

— грамадскія дзеячы **Людміла Гразнова, Анатоль Лябедзька, Васіль Шлындзікаў, Уладзімір Нісцюк;**

— журналісты **Сямён Букчын, Уладзімір Глод, Анатоль Гуляеў, Марына Коктыш, Алесь Сіліч, Андрэй Сяржан, Ганна Соусь, Марыя Эйсмант.**

Яны працуюць для вас, нашы чытачы.

У 2001 годзе газета распачала доўгатэрміновую праграму “Энцыклапедыя ”Народнай волі". Мы раскажам пра слынных вучоных, вайскоўцах, пісьменніках, дзеячах культуры, якія нарадзіліся ў Беларусі, сталі вядомымі ў свеце, але засталіся амаль невядомымі на Радзіме. Чытачы змогуць стварыць з газетых матэрыялаў уласныя Энцыклапедыі.

Больш увагі, чым раней, газета будзе ўдзяляць жыццю ў рэгіёнах краіны. Чытач ужо заўважыў нашу пастаянную рубрыку “Камандзіроўка”. Карэспандэнты “Народнай волі” ўвесь час у дарозе.

Як заўжды, на старонках “НВ” будуць прысутнічаць рубрыкі “Скандал”, “Закуліссе”, “Калідоры ўлады”, “Лёс чалавека”. Канешне, мы не забудзем спорт, шашкі, шахматы, крыжаванкі.

Няхай у вашай хаце будзе свята — “Народная воля”.

Паспяшайцеся падпісацца на “Народную волю”! Падпіска на другі квартал прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях, пунктах “Белсаюздруку”, у грамадскіх распаўсюджвальнікаў.

Кошт падпіскі — на ўзроўні чацвёртага квартала 2000 года:

Для індывідуальных падпісчыкаў (індэкс — 63222):

на адзін месяц — 1500 рублёў; на квартал — 4500 рублёў.

Для пенсіянераў, інвалідаў, уладальнікаў паўгадавой або квартальнай падпіскі (індэкс — 63429):

на адзін месяц — 1200 рублёў; на квартал — 3600 рублёў.

Для ведамаснай падпіскі (індэкс — 63225):

на адзін месяц — 3000 рублёў; на квартал — 9000 рублёў.



Навіны

Забастоўку прадпрымальнікаў падтрымалі 150 тысяч

Усеагульную забастоўку прадпрымальнікаў і асоб, якія працуюць па найме, што пачалася 28 лютага, падтрымалі па меншай меры 150 тысяч чалавек, або 70 працэнтаў ад агульнай колькасці асоб гэтых катэгорый. Такія папярэдныя звесткі паведаміў БелаПАН старшыня страйкама Валерый Леванеўскі.

Паводле яго інфармацыі, у Гродне бастуюць 90 працэнтаў прадпрымальнікаў, у Брэсце — 80, у Гомелі і Магілёве — ад 60 да 75. У Віцебску не працуюць 4 рынкі з 6. Падобная карціна назіраецца і ў раённых цэнтрах адпаведных абласцей. У Мінску поўнасцю спынена праца рынку “Дынама” (гэтую інфармацыю пацвярджае карэспандэнт БелаПАН, які пабываў там днём) і многіх больш дробных рынкаў. Апрача таго, забастоўку падтрымалі прадпрымальнікі, якія гандлююць на рэчавым рынку ў Ждановічах.

Бастуючыя вылучаюць наступныя патрабаванні:

- недапушчэнне павышэння існуючых ставак фіксаванага падатку; максімальны памер базавай стаўкі адзінага падатку павінен не больш чым на 75 працэнтаў перавышаць мінімальны;

- перагляд існуючай сістэмы налічэння кошту арэнды гандлёвых месцаў, прыцягненне да адказнасці вінаватых у парушэнні заканадаўства аб цэнаўтварэнні;

- адстаўка старшыні Дзяржаўнага падатковага камітэта.

Па словах Леванеўскага, у адрозненне ад папярэдніх, цяперашняя забастоўка арганізавана выключна сіламі страйкама. “Раней нам дапамагаў Свабодны прафсаюз, зараз жа разам з уладамі ён супрацьдзейнічаў правядзенню забастоўкі. Магчыма, гэта звязана з маім намерам узяць удзел у прэзідэнцкай кампаніі, паколькі Свабодны прафсаюз падтрымлівае іншага кандыдата”, — сказаў Леванеўскі.

Больш поўную інфармацыю аб забастоўцы страйкам наважаны сабраць вечарам, а затым паведаміць аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Маці Дзмітрыя Завадскага працягвае верыць

Вольга Завадская — маці прапаўшага аператара ГРТ Дзмітрыя Завадскага — спадзяецца, што яе сын жывы, хаця апошнія некалькі месяцаў ніякіх новых звестак аб ім не атрымлівала.

“Я не люблю распаўсюджваць чуткі і не жадаю слухаць "добразычліўцаў". Можа, таму не званяць. І ў апошнія месяцы я знаходжуся быццам у вакууме. Усё заціхла. Чым займаюцца следчыя органы, мне невядома", — сказала Вольга Завадская ў інтэрв’ю БелаПАН. І дадала: чуткі, якія былі літаральна “выплюхнуты” ў сродкі масавай інфармацыі, пра тое, што ў аўтамабілі былога афіцэра спецпадраздзялення “Алмаз” Ігнатовіча знойдзена сапёрная лапатка са слядамі крыві Дзмітрыя, што быццам бы знойдзена месца пахавання Завадскага, і таму падобныя, “мы пераварылі ўжо”.

Па словах Вольгі Завадскай, афіцыйныя асобы запэўнілі яе, што ўсе гэтыя чуткі не маюць пад сабою падстаў. “Я чамусьці ўпэўнена, што Дзіма жывы. Мне па-іншаму не думаецца. І мне чамусьці здаецца, што бліжэйшым часам сітуацыя павінна вырашыцца”, — сказала Вольга Рыгораўна. Паводле яе слоў, знікненне Дзмітрыя было “яўна падрыхтаванай, добра прадуманай дэманстратыўнай акцыяй”. “Як мне сказалі, суд над так званай групай Ігнатовіча будзе, але ў дачыненні да Завадскага фармулёўку змянілі. Ім ставяць у віну не забойства, а выкраданне. Але ўсё гэта не даказана — яны маўчаць або нам штосьці недагаворваюць. А Ігнатовіч — гэта асаблівы выпадак. Як мне сказала адна афіцыйная асоба, паездкі Ігнатовіча ў Чэчню быццам бы для вярбоўкі ў наёмнікі да баевікоў — гэта не прыватная ініцыятыва, а спецзаданне”.

Маці Завадскага не выключае, што сітуацыя з яе сынам можа быць выкарыстана ў мэтах правакацыі. Яна дапускае, што спецслужбы, якія абвінавачваліся ў датычнасці да знікнення Дзмітрыя, могуць “знайсці” яго якраз перад прэзідэнцкімі выбарамі. Магчыма, дзеля гэтага ўсё і было задумана. “А зараз знікненне Дзмітрыя выгадна ўсім, апрача Лукашэнкі. Нават, прабачце, сродкам масавай інфармацыі, — лічыць Вольга Завадская. — Я прыходжу да высновы, што ў нас у краіне страшна жыць. У нас чалавека могуць або знішчыць, або выкарыстаць для чыіхсьці мэтаў”.

Па словах Вольгі Завадскай, пасля знікнення сына яна звярталася да розных службовых асоб — Уладзіміра Пуціна, Аляксандра Лукашэнкі, Паўла Барадзіна, Урала Латыпава. Адказ прыйшоў толькі ад Лукашэнкі, ён складаўся з агульных спачувальных фраз.

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

Переписка

Довыборы в белорусский парламент — март 2001 года

Главному редактору
“Народной воли”
г-ну И.Середичу

Уважаемый Иосиф Павлович!

Прежде всего позвольте поблагодарить Вас за готовность сотрудничать с Консультативно-наблюдательной группой ОБСЕ в Беларуси и за интерес, который Вы проявили в отношении моей статьи о парламентских выборах в Беларуси. Статья была размещена на первой полосе “Народной воли” 23 февраля 2001 г.

Необходимо отметить, что фотография и немногочисленные редакторские правки, внесенные в текст, сделали статью наглядной, а язык публикации — более точным.

В то же время я хотел бы обратить внимание на тот факт, что написанная мною статья прошла в Вашей газете под заголовком “Без прозрачных, свободных и демократических выборов у Беларуси перспективы нет”. Название статьи было изменено без уведомления и согласия автора, который осознанно избрал иной заголовок: “Довыборы в белорусский парламент — март 2001 г.” Предложенный редакцией заголовок существенно изменил тон и смысловую направленность статьи, которые не соответствуют намерениям автора.

Я рассчитываю на то, что газета разместит в своем следующем номере пояснение о том, что заголовок статьи был изменен редакцией, а также напечатает оригинальное название статьи.

Разрешите еще раз поблагодарить Вас за совместное сотрудничество и надеюсь, что и в дальнейшем оно останется таким же плодотворным.

С уважением —
Д-р Ханс-Георг Вик
Посол,
руководитель
Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ в Беларуси.

От редакции. *Мы печатаем письмо господина Х.-Г.Вика,*

воспроизводя авторский заголовок статьи, опубликованной 23 февраля с.г. Одновременно хотелось бы заметить, что недоразумение произошло не по вине редакции. Об изменении заголовка мы поставили в известность тех лиц, которые передали статью господина Ханса-Георга Вика в редакцию. При этом надеялись на согласование с автором, чего, к сожалению, не произошло.

Навіны

Транзітная зона наркотыкаў

У Беларусі працягвае назірацца рост канфіскацыі з незаконнага абароту гэтак званых "цяжкіх" наркотыкаў, і перш за ўсё гераіну.

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі першы намеснік начальніка ўпраўлення нораваў і незаконнага абароту наркотыкаў МУС Мікалай Луканаў, калі на працягу 1994—1997 гадоў у краіне фіксаваліся адзінкавыя выпадкі канфіскацыі гераіну, то ў 1998 годзе іх ужо было 125, у 1999 — 305, у 2000 — 589 фактаў.

Па словах Луканава, адна з асноўных прычын гэтай сумнай статыстыкі звязана з геаграфічным становішчам Беларусі. Сёння краіна, па сутнасці, ператворана ў транзітную зону нелегальнай транспарціроўкі наркотыкаў: опій, гераін, марыхуана, гашыш ўвозяцца з краін Азіі праз Расійскую Федэрацыю для наступнай транспарціроўкі ў краіны Еўропы; макавая саломка — з Украіны як для ўжывання ўнутры краіны, гэтак і для наступнага транзіту ў Расію.

Для ажыццяўлення кантрабандных аперацый з наркотыкамі злачынцы выкарыстоўваюць цяжкасці з даглядам грузаў, перамяшчаемых транзітам і ў кантэйнерах. Апрача таго, як зазначыў Луканаў, працэсу распаўсюджвання "цяжкіх" наркотыкаў садзейнічае павелічэнне колькасці нелегальных мігрантаў, якія імкнуцца любымі спосабамі трапіць у краіны Заходняй Еўропы. Пры гэтым значная частка з іх, у сувязі з адкрытасцю ўсходніх межаў і закрытасцю заходніх, асядае ў Беларусі. Аператыўныя звесткі сведчаць, што нелегальныя мігранты, маючы шырокія сувязі ў сябе на радзіме, ствараюць на тэрыторыі краіны цэлыя арганізацыі па нелегальнай транспарціроўцы наркотыкаў. Паводле звестак МУС, на працягу некалькіх апошніх гадоў за незаконныя дзеянні з наркотыкамі на тэрыторыі Беларусі былі затрыманы 393 замежных грамадзяніны.

Аляксей АРЭШКА.

Новы міністр абяцае палепшыць экалогію

Вынікі выканання і практычнага выкарыстання дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы "Прыродакарыстанне і ахова навакольнага асяроддзя" абмяркоўваліся на пасяджэнні калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Пасяджэнне вёў новы міністр Лявонцій Харужык, нядаўна прызначаны на гэтую пасаду. Падчас пасяджэння ён неаднаразова падкрэсліваў, што эканамічны эфект ад рэалізацыі кожнага экалагічнага праекта павінен быць прадстаўлены грамадству ў даступнай форме.

Даведка БелаПАН. Лявонцій Харужык нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Жыровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. Пасля заканчэння школы і тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі ў Жыровічах вучыўся ў Беларускім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі. Займаў розныя пасады ў калгасе, райкаме камсамола і Жыровіцкім саўгасе-тэхнікуме. Пасля пераезду ў Мінск і з 1984 па 1993 год працаваў у Рэспубліканскай інспекцыі катланагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі. Затым перайшоў на пасаду дырэктара грамадскай арганізацыі "Беларуская рэспубліканская асацыяцыя спецыялістаў па ахове працы". У 1994 годзе ўзяў удзел у перадвыбарнай кампаніі прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Са жніўня 1994-га да лютага 2001 года працаваў першым намеснікам кіраўніка спраў прэзідэнта.

Марат ГАРАВЫ.

Канфлікт на Наваполацкай ЦЭЦ

Члены пярвічнай арганізацыі незалежнага прафсаюза Наваполацкай ЦЭЦ звярнуліся з адкрытым лістом да сваіх калег з галіновага прафсаюза, які ўваходзіць у склад Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай, якая таксама дзейнічае на прадпрыемстве. У лісце змяшчаецца заклік да супрацоўніцтва і прафсаюзнай салідарнасці.

Падставай для звароту стаў канфлікт паміж адміністрацыяй ЦЭЦ і прадстаўнікамі незалежнага прафсаюза. Ён узнік пасля таго, як адміністрацыя прыняла рашэнне аб памяншэнні працягласці адпачынку работнікаў ЦЭЦ да мінімальнага, вызначанага Працоўным кодэксам.

Расцаніўшы гэтае рашэнне як парушэнне калектыўнага дагавора і запатрабаваўшы яго адмены, прафсаюз, як адзначаецца ў лісце, стаў "аб'ектам агрэсіі": "адміністрацыя пачала беспрэцэдэнтную кампанію ціску на членаў незалежнага прафсаюза". Сітуацыя яшчэ больш накалілася пасля таго, як адміністрацыя, зноў жа парушаючы калектыўны дагавор, вырашыла паменшыць аплату за працу ў выхадныя і святочныя дні. На гэты момант, адзначаецца ў лісце, кіраўніцтва ЦЭЦ парушае ў агульнай складанасці 21 пункт калектыўнага дагавора, а таксама працоўнае заканадаўства.

Такая палітыка прывяла да памяншэння колькасці незалежнага прафсаюза, членамі якога зараз з'яўляюцца 135 чалавек. Аўтары адкрытага ліста заклікаюць сваіх калег з галіновага прафсаюза супрацоўнічаць з імі, а не з адміністрацыяй, паколькі абодва дзеючых на прадпрыемстве прафсаюзы павінны быць "хаўруснікамі, а не антаганістамі".

Наталля КУЛАГІНА.

Насельніцтва зменшылася на 29,3 тысячы чалавек

Паводле апошніх звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, за 2000 год насельніцтва Беларусі зменшылася на 29,3 тысячы чалавек — да 9 990,2 тысячы.

Як і ў папярэднія гады, гэтае скарачэнне было абумоўлена перавышэннем колькасці памерлых над народжанымі пры адначасовым змяншэнні міграцыйнага прыросту. Так, за мінулы год у Беларусі нарадзілася 93 141 чалавек, памерла 134 517. Колькасць прыбыўшых у краіну з іншых краін — 209 767, колькасць выбыўшых — 197 636. Міграцыйны прырост у 2000 годзе ў параўнанні з 1999-м знізіўся на 31 працэнт.

Натуральны спад насельніцтва назіраецца ў краіне з 1994 года. За апошнія шэсць гадоў колькасць жыхароў скарацілася больш чым на 300 тысяч. Гэта першае вядомае за ўсю гісторыю Беларусі такое працяглае зніжэнне колькасці насельніцтва ў выніку натуральных страт. Асноўнымі яго прычынамі з'яўляюцца рост смяротнасці і спад нараджальнасці. Так, калі ў 1990 годзе каэфіцыент нараджальнасці на 1000 жыхароў складаў каля 14 чалавек, то ў 2000-м — 9,3; каэфіцыент смяротнасці — адпаведна 10,7 і 14,2. Асноўнымі прычынамі смяротнасці жыхароў Беларусі летась былі хваробы сістэмы кровазвароту (53,7 працэнта ўсіх выпадкаў) і новаўтварэнні (14,5 працэнта).

Сяргей СНЕГІН, БелаПАН.

Фокус в жанре "интеграция"

Российско-белорусского таможенного союза попросту не существует

— Ты из Москвы приехал? Ну и как там поживает Россия-кормилица? — второй вопрос моего собеседника Сергея был скорее дежурным. Он и сам часто ездит в Россию. Потому и называет "кормилицей", что почти весь бизнес он делает на торговле с Россией. Кому, как не ему, разбираться в хитросплетениях белорусско-российской торговли и таможенного союза.

— Таможенный союз? — удивился он. — Да ты собираешься писать о том, чего давно не существует.

Сергей не первый, от кого я слышу такие слова. А ведь только накануне, когда я уезжал из Москвы, прозвучали заявления Михаила Касьянова и даже Владимира Путина: формирование единой таможенной системы завершено, два премьер-министра даже соглашение соответствующее подписали. Я попробовал проверить эти заявления на практике.

И выяснилась странная вещь: на самом деле таможенного союза между двумя странами не существует. Его как-то незаметно отменили. Но не стоит огорчаться — как оказалось, это пошло на благо обоим государствам. И претензий друг к другу стало меньше, и бюджеты двух стран перестали нести ощутимые потери.

Крах "белорусского транзита"

Недавно Российский таможенный комитет подорвал веру в интеграцию у автолюбителей. До последнего времени "белорусский транзит" пользовался огромной популярностью у россиян, желающих купить недорогой автомобиль. Пошлины на автомобили в союзном государстве в 2—4 раза ниже, чем в России. Российский бюджет на подобном "автомобильном антипатриотизме" терял большие деньги. С февраля халява для автолюбителей закончилась — ГТК заставляет доплачивать разницу в пошлинах за растаможенные на белорусской территории машины.

ГТК, похоже, решил серьезно побороться с представлением о Беларуси, как о "черной дыре" для российского бюджета. А такой имидж за Белорусским государством закрепился давно и не без оснований.

Схем, которые лишали российский бюджет миллиардных доходов, было много. Многие играли на разнице пошлин, как в случае с автомобилями. "Привозили товар из Европы, растаможивали по низким пошлинам в Беларуси и гнали в Россию — границы-то нет", — объясняет эту простую схему Сергей. Российский бюджет в этой схеме не получает ничего.

Некоторые аферы были еще масштабнее, их авторы добивались "законных" льгот по уплате пошлин. "Если верить белорусской официальной статистике, — рассказывает экономист Валентина Юрик, — в 1996 году белорусский народ стал пить водки в 350 раз больше, чем годом раньше: импорт водки увеличился на 35 017,4 процента. Работала простая схема — фирма, близкая к белорусским властям, получает льготы по уплате таможенных пошлин. Она завозит товар на белорусскую территорию, а оттуда — в Россию".

Существование такой схемы признают даже белорусские власти. "Да, были и у нас такие фирмы, — соглашается председатель Государственного таможенного комитета Беларуси Викентий Макаревич. — Но ведь и у вас были всякие национальные фонды спорта, которые получали льготы. Но мы же не говорим, что Россия — это "черная дыра" для нас. А сейчас таких фирм в Беларуси нет".

Были и промышленные схемы. Почему недавнее введение Беларусью экспортных пошлин на нефтепродукты вызвало такой восторг Владимира Путина? Да потому, что до того момента российские фирмы ввозили нефть в Беларусь, платя не экспортную пошлину (порядка 35 процентов) а лишь НДС (20 процентов). В Беларуси сырье перерабатывали и продавали за рубеж. Итог — 15-процентная выгода предпринимателям и такие же потери для российского бюджета. По официальным подсчетам, Россия теряла на этом 70 миллионов долларов в год.

Сумма всех потерь оценивалась по-разному — от 400 млн. до 1 млрд. долларов в год. Но за несколько лет Таможенный комитет России своими действиями практически перекрыл все эти схемы. Жертвой борьбы за доходы российского бюджета пал таможенный союз, который декларировал когда-то свободное перемещение любых товаров в границах двух стран.

Прощание с таможенным союзом

Главное, что сделала Россия, — ввела таможенные пошлины на товары из третьих стран, которые везут в Россию через Беларусь. То есть в одностороннем порядке восстановила таможенную границу с Беларусью.

"Схемы, которые позволяли предпринимателям экономить и не платить пошлины в российский бюджет, стали бессмысленны, — объясняет мне Сергей. — Раньше играли на разнице пошлин. А сейчас — зачем сейчас везти товар в Россию через белорусскую территорию, если пошлины придется платить два раза? Тем более что в России можно без проблем растаможить товар "по-черному" и сэкономить без белорусского участия. Мелкая контрабанда, конечно, остается, но, я думаю, это не катастрофа для российского бюджета".

Беларусь такой рациональный подход поначалу не восприняла и поплатилась. "Где-то с конца 1997 года, — говорит Валентина Юрик, — от существования таможенного союза Беларусь начала терять еще больше, чем Россия. Знаете, сколько в 1999 году в Беларусь было официально импортировано телевизоров и мониторов? 740 штук на 10-миллионную страну. Все, что продается в каждом магазине, — это реэкспорт из России, где таможенные пошлины на телевизоры ниже".

Специалисты посчитали, говорит Валентина Юрик, что на таком "сером" импорте из России бытовой техники, компьютеров, продуктов питания Беларусь в 1999 году потеряла около 400 млн. долларов.

Невидимая граница

В конце концов и Беларусь ввела пошлины на товары третьих стран. Белорусско-российская граница сформировалась полностью. Таможенные посты стоят до сих пор на всех крупных трассах. С белорусской стороны очень скромные вагончики, с российской — все значительно солиднее — со складами, площадками досмотра, штрафными стоянками. Белорусские чиновники сокрушаются, что это не лучшая иллюстрация интеграционных процессов, но таможенников это не смущает.

Вот Александр Лукашенко на днях распорядился всех белорусских таможенников из их вагончиков убрать. Исполнили. Теперь с нетерпением ждут ответного шага россиян. Потому что важен внешний эффект. "Пошлины на автомобили и на другие товары можно брать не только на границе, — говорит Викентий Макаревич. — И мы до марта должны решить, как убрать эти посты, чтобы президенты на заседании Высшего совета Союза могли сказать: границы между нашими странами снова нет!"

Вот если бы еще президенты могли сказать, что все таможенные пошлины унифицированы... Но это сложнее. Как ни пытаются договориться — ничего не получается. Вот ведь даже в ставках пошлин на кухонную посуду не сошлись — 20 процентов в России и 25 — в Беларуси. Кто бы мог подумать, что тарелки для супа станут препятствием в интеграции.

Виктор ДЯТЛИКОВИЧ.
Минск—Москва,
"МН".

Дзядуліна навука. Яна можа застацца на ўсё жыццё. А можа і забыцца...
На здымку: *Яўген Вячаслававіч Усюкевіч з унукам Косцікам. Яны жывуць у Навагрудку.*
Фота IREX/ProMedia.

Тэлевізійныя "благоглупости"

Пра "эратычную" сувязь паміж тэлебачаннем і прэзідэнцкім апаратам

Агенцтва тэлевізійных навін праінфармавала нас аб нарадзе прэзідэнцкага апарату, якую, па даручэнні А.Р.Лукашэнкі, правёў кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта спадар-таварыш М.У.Мясніковіч. (Форма этыкету абрана свядома, каб Міхась Уладзіміравіч не абразіўся на "спадара", бо хоць ён і "шчыры беларус", але, што ні кажы, па правую руку падчас нарады сядзеў чысты "таварыш" — яго намеснік.)

"Агентка" з агенцтва (шкада слова "журналістка") паведаміла, што на нарадзе абмяркоўвалася пытанне аб неабходнасці карэнным чынам змяніць работу апарату. Не паспела я асэнсаваць гэты аварыйны "карэнны чын", як у кадры кіраўнік Адміністрацыі спакойна, разважліва звяртаецца да прысутных з прапановай "несколько изменить работу аппарата", і змены, паводле яго слоў, найперш датычылі кадравай палітыкі.

Хаця і цяжка сэнсава ўвязаць гэтыя арыенціры — змены ў рабоце апарату і кадравую палітыку, але, згодна з правіламі камунікацыі, я была падрыхтавана ўспрымаць наступную інфармацыю: чым выкліканы змены? Інфарматарка прычыны зменаў засакрэціла, а замест гэтага пахвалілася, што тэлебачанне атрымала, як ні дзіўна, станоўчую ацэнку сваёй дзейнасці. Больш таго, у кадры Міхаіл Уладзіміравіч паспачуваў тэлебачанню, маўляў, "готовых покритиковать вас достаточно". І падвучыў тэлебачанне: "свою работу нужно уметь показать".

Разважаю: што ж я толькі што пачула ды пабачыла?

АТН вуснамі сваёй станоўчай супрацоўніцы зганьбіла работу апарату і яго кіраўнікоў, выставіла ўсіх недзеяздольнымі ці то фізічна састарэлымі, ці то маральна, што азначае "не подсекают", "не рубят", "не волокут" у працэсах кантынентальзацыі і глабалізацыі, у найноўшых кіраўнічых тэхналогіях. Бо што азначае "карэнным чынам змяніць работу"? Пагартаем слоўнікі, тлумачальныя і фразеалагічныя, рускія і беларускія — ва ўсіх адно тлумачэнне (праўда, Тлумачальны слоўнік беларускай мовы адрасаваў мяне да слова на тры літары: гл.**чын**). "Карэнным чынам (змяніць)" — у аснове сваёй, радыкальна, у корані; у дачыненні да кадравай палітыкі прыдасца яшчэ і сінонім "пад корань"; "коренным образом" — совершенно, полностью, целиком, в корне (изменять, ломать, уничтожать и т.п.) і прыклад: "Ну, ладно, Варюха, я, конечно, скотина,.. но не такая уж. Вот увидишь, переменюсь в корне" (Ю.Герман. "Дело, которому ты служишь").

Перадумовы "карэннага чыну" ў прыкладзе навідавоку. Змяніць такім чынам работу азначае, як кажуць, завярнуць яго (апарат) тварам на патыліцу. "Службістка" са службы тэлевізійнай інфармацыі не чуе сваіх слоў. Яна ў экстазе, у эйфарыі ад гонару вяшчаць пра чарговую рэфармацыю-генералізацыю ў якім бы то ні было кантэксце.

А яно ж, тэлевізійнае слова, — праява ўзроўню мыслення, інтэлекту. Бессэнсоўныя выразы, а іх у тэлеэфіры процьма, — не проста агаворкі, на якія спішуць і гэты выпадак. Мова і мысленне — гэта асобная галіна нацыянальных культур ва ўсім свеце, так званая лагасфера (грэч.logos — слова, мысленне плюс соцыум). Сродкі масавай інфармацыі, з аднаго боку, — адлюстраванне, адбітак нацыянальнай лагасферы, з другога — уплывовы стваральнік яе. Вось і рабіце выснову з маўленчых паводзінаў прадстаўніцы АТН. Яна прадэманстравала найгоршы ўзор маўленчай дзейнасці для носьбітаў мовы. Да таго ж хлусліва адлюстравала маўленча-мысліцельны працэс высокай асобы з прэзідэнцкага апарату. Фармулёўка "несколько изменить" зыходзіла ад асэнсаванага падыходу да ацэнкі сітуацыі і атрымала правільнае моўнае выражэнне. Інтэрпрэтацыя сітуацыі журналісткай абумоўлена не розумам, а рэфарматарскай страсцю — усё мяняць карэнным чынам! Нават "ворагі ў законе" — апазіцыянеры — і тыя, шануючы ўладу, патрабуюць не карэнных, а простых "Пераменаў!" А што з клічнікам — дык каб лепш было чуваць.

Крыўдна за прэзідэнцкі апарат. Мне падалося, што ў зале сядзелі сапраўдныя мужчыны, з моцным коранем і здольныя да такога кахання, што нават на абразу адрэагавалі "похвальным словом глупости".

"Пусть царствует эрос, но красиво, по-римски".

Марыя КАРПОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук.
Мінск.

На "прафсаюзным фронце" працягваюцца баі...

Беларускія ўлады, добра патузаўшыся з дэпутатамі Вярхоўнага Савета, апазіцыяй, партыямі і рухамі, Амерыкай, Еўрапейскім Саюзам, АБСЕ і іншымі, апошнім часам счапіліся з прафсаюзамі. Галоўная віна апошніх у тым, што іхні лідэр Ганчарык намерыўся на прэзідэнцкіх выбарах выставіць сваю кандыдатуру на высокае дзяржаўнае крэсла. Разгневаныя такім не сяброўскім жэстам, улады адмовіліся падпісваць ужо ўзгодненае Генеральнае пагадненне, адкрылі агонь па прафсаюзах з дзяржаўных СМІ, затым кінулі ў бой сваю цяжкую артылерыю — Канстытуцыйны суд, які даў залп пад самы дых, па прафсаюзных узносах.

Чым выклікана такая цікавасць да ўзносаў?

Трэба сказаць, што Канстытуцыйны суд даволі аператыўна вынес рашэнне "Аб парадку ўплаты членскіх прафсаюзных узносаў". Да таго ж, як кажуць, справа была распачата на падставе заявы аднаго грамадзяніна. Але прафсаюзы яно не напужала.

Канстытуцыйны суд адзначыў, што наймальнікі маюць права рабіць утрыманні шляхам безнаяўнага пералічэння членскіх прафсаюзных узносаў на рахункі прафсаюзных органаў толькі пры наяўнасці пісьмовай заявы работніка на такое пералічэнне. Як патлумачыў нам намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай Мікалай Беланоўскі, такая практыка ўжо існуе ў большасці арганізацый. Таму рашэнне Канстытуцыйнага суда адпавядае дакументам прафсаюзнай арганізацыі. Калі недзе яшчэ не зроблена так, як трэба, дык будуць прыняты захады па ліквідацыі недахопаў.

У такім выпадку ўзнікае пытанне: "Чым выклікана такая цікавасць да прафсаюзных узносаў?". Мяркую, яна відавочная. І дарэмна асобныя прафсаюзныя лідэры не надаюць рашэнню Канстытуцыйнага суда патрэбнай увагі. У ім, між іншым, гаворыцца і аб тым, што Канстытуцыйны суд прызнаў парушэннем канстытуцыйных праў работнікаў, якія не з'яўляюцца членамі прафесіянальных саюзаў, але ўтрыманне пэўных сум з іх заробкаў у ліку ўплаты ўзносаў праводзілася. Узнікаючыя ў гэтай сувязі спрэчкі могуць быць вырашаны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку. Нарэшце, дзе гарантыя, што хутка не пачнецца агітацыя рабочых забраць свае заявы наконт утрымання з заробкаў тых узносаў? Так што ў прафсаюзаў могуць з'явіцца фінансавыя цяжкасці, а іх лідэры будуць уцягнуты ў разборкі. У такім разе ім будзе не да прэзідэнцкіх выбараў. Відаць, менавіта гэтым і кіраваліся ўлады, адкрываючы фронт па прафсаюзных узносах.

Аб чым Бухвостаў напісаў Генеральнаму пракурору?

Перашкоды на шляху членскіх узносаў многія чыноўнікі пачалі ўжо ўзводзіць. Аб гэтым гаворыцца ў пісьме Генеральнаму пракурору Беларусі В.Шэйману, якое накіраваў яму старшыня савета прафсаюза работнікаў аўтасельгасмаша А.Бухвостаў. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што ў адпаведнасці з артыкулам 27 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прафесіянальных саюзах" прафсаюзы валодаюць і распараджаюцца належачым ім на правах уласнасці маёмасцю і грашовымі сродкамі, да якіх у першую чаргу адносяцца членскія прафсаюзныя ўзносы. Але некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў на працягу доўгага тэрміну незаконна валодаюць сумамі членскіх прафсаюзных узносаў і не пералічваюць іх на рахункі структур прафсаюза работнікаў аўтасельгасмаша. І гэта нягледзячы на тое, што згодна Генеральнаму і галіноваму тарыфным пагадненням, калектыўным дагаворам яны павінны гэта рабіць. Запазычанасць па ўзносах ужо складае 172 мільёны рублёў. Выкарыстанне ў сваіх мэтах прафсаюзных узносаў наймальнікамі парушае правы членаў прафсаюзаў, перашкаджае іх законнай дзейнасці. З-за гэтага зрываюцца многія аздараўленчыя мерапрыемствы, у прафсаюзных камітэтах скапіліся тысячы заяў работнікаў аб атрыманні матэрыяльнай дапамогі.

Звароты савета прафсаюза ў Міністэрства прамысловасці, Савет Міністраў Беларусі не далі станоўчых вынікаў. Кіраўнік прафсаюза аўтасельгасмаша лічыць, што ў такіх дзеяннях адказных асоб прадпрыемстваў утрымліваюцца прыкметы злачынства, якое кваліфіцыруецца артыкулам 194 Крымінальнага кодэкса як перашкода законнай дзейнасці прафсаюзаў.

Такі ж контрудар спадар Бухвостаў зрабіў яшчэ ў адным накірунку. А дакладней, з аналагічным пісьмом ён звярнуўся і да старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю А.Тозіка, якога просіць звярнуць увагу на затрымкі з пералічэннем прафсаюзных узносаў і дапамагчы аднавіць законнасць і справядлівасць.

Да абодвух заяў прыкладзены спісы прадпрыемстваў, якія дапусцілі запазычанасць па пералічэнні ўзносаў. З іх відаць, што Мінскі трактарны завод завінаваціўся 60 мільёнаў рублёў, акцыянернае таварыства "Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання" — 22,9 мільёна, Мінскі маторны завод — 20 мільёнаў рублёў. Больш 26 мільёнаў рублёў прафсаюзных узносаў утрымлівае Мінскі завод калёсных цягачоў, 20 мільёнаў — ААТ "Мінскі падшыпнікавы завод", болей 11 мільёнаў — акцыянернае таварыства "Мотавела" і г.д.

Чаму ж Канстытуцыйны суд, які займаўся разглядам справы па членскіх узносах, не звярнуў увагу на гэтыя парушэнні?

Атака на словы "зніжэнне", "спрашчэнне"

У Федэрацыі прафсаюзаў адбылася прэс-канферэнцыя, на якой першы намеснік старшыні Ф.Вітко распавёў пра наступ улад па шматлікіх накірунках. Тэатр дзеянняў пашырыўся на рэгіёны. У некаторых месцах перашкаджаюць праводзіць прафсаюзныя сходы, нарады прафактыва. Калі раней закапёршчыкам выступала адміністрацыя прэзідэнта, дык апошнім часам у барацьбу ўзягваецца і ўрад, які актывізаваў свае намаганні на блакіраванні Генеральнага пагаднення, якое павінна стаць асновай сацыяльнага партнёрства.

Яшчэ 8 снежня было ўзгоднена рашэнне па спрэчных пунктах. Але пазней урад даў задні ход. Тройчы збіралася пагадняльная камісія і... ніякіх зрухаў. Відаць урад атрымаў загад: "Ні кроку наперад". А днямі адтуль прыйшоў у Федэрацыю прафсаюзаў тэкст пагаднення для ўзгаднення. У ім аказаліся пералапачанымі многія ўжо адобраныя палажэнні. Скажам, калі раней у дакуменце гаварылася аб зніжэнні падатку з асоб, якія маюць нізкія даходы, дык цяпер слова "зніжэнне" заменена словам "змяненне". А ў які бок будзе тое змяненне? Відаць, урад хоча самастойна вырашаць так, як толькі яму выгадна. У другім месцы важнага дакумента было зафіксавана палажэнне аб спрашчэнні рэгістрацыі прадпрымальніцкіх структур. І тут слова "спрашчэнне" заменена на "упарадкаванне". Зноў жа, урад хоча пасля рабіць так, як яму ўздумаецца. Словам, прадстаўлены заведама непрыймальны тэкст дакумента.

Улады актывізавалі свае дзеянні па распрацоўцы новага Закона аб прафсаюзах. Прафсаюзная разведка змагла дабыць адзін з варыянтаў. У ім — напалеонаўскія замашкі. Мяркуецца выкрэсліць з прафсаюзаў навучэнцкую моладзь, пенсіянераў, права гарантыі для прафсаюзных лідэраў наведваць рабочы месцы, на якіх працуюць члены прафарганізацый...

Спачуваючыя прафсаюзам з калідораў улады сцвярджаюць, што існуюць куды больш радыкальныя варыянты новага Закона, у якіх нібыта прадугледжваецца скасаванне галіновых прафсаюзаў і стварэнне новых аб'яднанняў, што вымусіць прафсаюзы з галавой акунуцца ў шматлікія паседжанні, распрацоўку статутных дакументаў, рэгістрацыю і г.д., словам — у папярова-засядальніцкую завіруху. Тут ужо будзе не да прэзідэнцкіх выбараў і сацыяльнай абароны працоўных.

Алесь ДРАБЧУК.

Бизнес-класс

Соичиро ХОНДА – упорный оптимист, вдохновитель байкерского движения

Томас Эдисон утверждал, что "созидательность на 99 процентов — это трудная работа, и на 1 процент — вдохновение". ***Соичиро ХОНДА,*** *основатель одноименной японской автомобильной и мотоциклетной корпорации, согласился с этим и построил свой успех на "провалах". Он верил, что метод проб и ошибок — прелюдия к настоящему успеху.*

Хонда дал краткий философский совет всем успешным бизнесменам: "Предприниматели должны быть готовы ставить перед собой неправдоподобные цели и должны быть готовы к поражениям". Хонда, как и Эдисон, считал каждую неудачу ступенью, приближающей его к грандиозному успеху, невзирая какой ценой.



Мечта магната

Когда Хонда был ребенком, у него была мечта. Он мечтал в один прекрасный день стать владельцем автомобиля. Вряд ли он тогда предполагал, что не просто будет иметь автомобиль, а станет одним из титанов производящей их индустрии. Хонде было предначертано судьбой повлиять на промышленность мотоциклов и автомобилей больше, чем кому-либо другому в мире.

Его влияние заключалось в радикальном изменении не только продукции, но и всего рынка данного товара. Исключительно "на его совести" создание мотоцикла, который получил также широкое признание в обществе, что послужило образованию нового обширного сегмента рынка. Продукция Хонды была предназначена как для женщин, так и для мужчин, и рассчитана на средний класс, который никогда ранее не принимали в расчет производители.

Сила Хонды была в технической элегантности, красоте дизайна и рыночной интуиции. Он не имел ни инженерной подготовки, ни опыта (окончил только восемь классов). Он ничего не знал о маркетинге, финансах и дистрибьюторстве; дитя аграрной Японии, Хонда не имел представления о большом бизнесе и международной торговле. Он достиг успеха вопреки "дзайбацу" (японские конгломераты), которые считали его аутсайдером и бунтарем. Не только японцев изумил его успех, — то же самое можно сказать как о педантичных немцах, которые владели богатым рынком, так и о снобах американцах, которым принадлежали все остальные рынки.

К началу 80-х Хонда стал третьим в числе крупнейших производителей автомобилей в Японии, а к концу 80-х годов — третьим в мире. Уже в 60-х он доминировал в производстве мотоциклов (70 процентов рынка). К 1990-му он выпускал более трех миллионов мотоциклов в месяц и до сих пор удерживает 60 процентов всего мирового рынка. Неплохо для человека с малоклассным образованием, у которого была мечта и, кроме того, упорство, чтобы воплотить ее в жизнь. Джордж Гилдер считает Хонду "уникальным, самым блестящим и успешным предпринимателем в автомобильной промышленности после Генри Форда". Британская "Санди Таймс" в своем автообзоре в 80-х писала: "Точность технических решений Хонды, похожих на работу ювелира, изумляла каждого инженера, с которым мне доводилось говорить".

Личная история

Соичиро Хонда был первенцем в очень бедной семье, жившей в японской аграрной провинции Хамамацу. Он родился 17 ноября 1906 года. Семья была настолько бедна, что пятеро из детей умерли от голода еще в младенческом возрасте. Хонда был сыном бедного кузнеца, занимавшегося починкой велосипедов. Эта ранняя причастность к спортивному транспорту во многом определила будущий интерес Хонды к мотоциклам. Уроки отца, в ходе которых он получил навыки решения технических проблем, стали важным фактором в его начальном обучении.

Соичиро был бедным учеником и часто прогуливал школьные занятия, поскольку ненавидел школу. Он предпочитал технику экспериментирования и всегда лучше учился на своем опыте и ошибках. Он всегда любил машины и механические устройства и был буквально загипнотизирован, когда, будучи еще ребенком, впервые увидел автомобиль.

От поршневого кольца до супергиганта промышленности

Хонда стал известен благодаря изобретению в 1938 году поршневого кольца. Он образовал новую компанию, которая занималась производством этих колец для компании "Тойота" в Токио. Так продолжалось и во время войны, пока его фабрика не пострадала при бомбардировке. Землетрясение 1945 года полностью разрушило ее. Хонда был расстроен, распродал все и пошел работать на полставки. Его приход на рынок мотоциклов был совершенно случайным.

Как-то в 1946 году Хонда столкнулся с проблемой — у него не было бензина для машины, тогда он взял один из моторов, не множество оставленных американскими военными, и приделал его к своему велосипеду. Двигатель был наполнен керосином. Подобные простые, но элегантные решения фундаментальных проблем — обычный стиль Хонды. Затем он стал делать свои моторы по просьбам друзей. Выполнив с десяток таких заказов, как и можно было ожидать, рвущийся ко всему новому Хонда предположил, что рынок подобной машины может быть значительно больше. В 1948 году основал "Хонда Мотор Компани" с целью разработки и производства мопедов.

Свой первый мопед Хонда окрестил мотором "Д" (от английского слова dream — "мечта"). Модель "Е" типа "Дрим" была запущена в производство в 1951 году, и к 1958 году, когда в США появилось его "Супер Каб", Хонда стал крупнейшим производителем мопедов в Японии, оставив позади пятьдесят конкурентов. Модель "Супер Каб" имела уникальную подножку, которая очень приглянулась подросткам и женщинам. Вскоре эта модель произвела настоящую революцию в промышленности. Был создан новый имидж байкера, способствовавший популяризации мотоцикла. С этого момента образ "Ангелов Ада" в черной кожаной куртке ушел в прошлое. Благодаря низкой цене и отличному качеству исполнения рынок этой модели расширился до миллионов единиц.

Хонда пришел на автомобильный рынок в 1970-м с автомобилем "Сивик". Он продолжал оснащать свои модели техническими новинками так же, как делал это, когда завоевывал рынок мотоциклов и так же все еще не был любимым сыном японской машиностроительной промышленности. Он был настоящим бунтарем, особенно это проявилось, когда в 1974 году на Японию обрушился нефтяной кризис и японские производители пришли к соглашению сократить объем производства продукции и поднять цены. Только Хонда отказался и сделал все наоборот. Хонда удвоил производство и снизил цены больше, чем Форд пятьдесят лет назад. Хонда, который даже не имел понятия о ценовой эластичности, оказался прав. Объем продаж компании "Ниссан" и "Тойота" упал на 40 процентов; объем продаж "Хонды" вырос на 76 процентов и продолжал стремительно расти. "Хонда" стала самой быстрорастущей компанией в мире.

Господин Гром и Дамский угодник

В юности Соичиро Хонда вел себя легкомысленно и был дамским угодником. Он был известен как "Плейбой из Хамаматсу", человек, который отдавал себя на любую провокацию. Его любовь к веселью и беззаботность привели к тому, что как-то он свалился с моста с двумя гейшами в машине. Он спас их, выкинув в окно.

Эта экстравагантная личность была известна как "Господин Гром" среди служащих из-за его эмоциональных взрывов в ответ на какую-нибудь глупость работников. Они любили Хонду, но побаивались его гнева.

Дух свободы, присущий многим разработкам Хонды, подтверждает, что он действительно неустанно обдумывал свои детища. Он обладал духом свободы и сражался против традиций на протяжении всей карьеры. Он отказывал в приеме на работу в фирму "Хонда" специалистам, получившим формальное образование в течение многих лет, поскольку чувствовал, что их догматическое мышление будет помехой в поисках нового.

Хонда много внимания уделял экспериментальной работе и сопротивлялся любой попытке контролировать его или его фирму через традиционную кастовую систему. Он был против иерархической формы управления, что ясно из следующей его цитаты: "В целом люди работают напряженнее и более инновационно, если их не принуждают что-то делать". Какая проницательность! С тех пор психологами уже неоспоримо доказано, что Хонда был прав, и новые стили руководства приближаются к методологии.

Мотоциклетный Форд

Хонда сделал для мотоциклов то, что Генри Форд сделал для автомобилей. Он взял бездействующий застойный рынок и сделал его действующим и динамичным. Его упорное стремление к совершенствованию мечты о превосходной машине воплотилось в элегантных мотоциклах. "Хонда" была постоянной законодательницей мод в дизайне мотоциклов во всем мире в течение длинных пятидесятых по настоящее время.

Признание и успех — заслуга вышедшего из нищенской среды небольшого японского городка человека с современным складом ума и готовностью рисковать в поисках нового, который пришелся по душе американцам. В Японии, стране, где общественная лояльность ставится во главу угла, Хонда был настоящим нонконформистом. Его прозвище "Господин Гром" вроде бы так не соответствовало невыдающемуся росту и непостижимому поведению типичного японского руководителя. Он является примером упорства, скромности, приятных манер и способности воспринимать ошибки как ценнейший актив.

Соичиро Хонда умер 5 августа 1991 года в Токио.

Дежурил по бизнес-классу
Александр СИЛИЧ.

Борис ЕЛЬЦИН

Таня

(Продолжение. Начало в № 41.)



...В конце 1995 года в моем ближайшем окружении (а неформальным его лидером тогда был Александр Коржаков, руководитель моей охраны), стала обсуждаться идея: наследником Ельцина должен быть не проигравший думские выборы Виктор Черномырдин, а Олег Сосковец, первый вице-премьер. Статный мужчина "с открытым русским лицом", настоящий хозяйственник, бывший директор металлургического завода, по сути дела, второй человек в правительстве, он был вполне достойной представительной фигурой. Тогда я еще не до конца понимал, насколько опасен Коржаков в роли "спасителя отечества", почему он так рьяно протежировал своему ближайшему другу Олегу Сосковцу.

Мне никто ничего не говорил в открытую, но я и так видел, как упорно Коржаков подталкивает меня к тому, чтобы я отправил в отставку Черномырдина. Дальнейший ход событий просматривался тоже достаточно четко: на волне борьбы с чеченским сепаратизмом, на волне "коммунистической угрозы" к власти приходит полувоенная команда постсоветских генералов: начальник службы безопасности Александр Коржаков, директор ФСБ Михаил Барсуков, которых прикрывает своим могучим телом первый вице-премьер Олег Сосковец. Найдутся и другие...

Буду неискренен перед читателем, если скажу: вот именно так я тогда и думал, именно поэтому и пошел на выборы. Нет, не поэтому:

Я стоял перед жизнью, продуваемый всеми ветрами, сквозняками, стоял и почти падал от порывов ветра: крепкий организм — подвел; "ближайшие друзья" — уже нашли тебе замену, как стая, которая исподволь, постепенно намечает нового вожака; наконец, отвернулись от тебя и те, на кого ты всегда опирался, кто был твоим последним рубежом, резервом, — духовные лидеры нации. А народ... Народ не может простить ни "шоковой терапии", ни позора в Буденновске и Грозном. Казалось бы, все проиграно.

В такие моменты приходит прозрение. И вот с ясной головой я сказал себе: если иду на выборы — выигрываю их, вне всяких сомнений. Это я знаю точно! Несмотря на все прогнозы, несмотря на рейтинги, несмотря на политическую изоляцию. Но вот вопрос: иду ли? Может, действительно пора мне сойти с политической сцены?

Но мысль о том, что я тем самым буду способствовать приходу к власти коммунистов, показалась нестерпимой.

Вероятно, выручила моя всегдашняя страсть, воля к сопротивлению.

В конце декабря я свой выбор сделал...

...А потом появилась Таня.

Читатель не должен удивляться, встретив в книге эту фразу. Лена и Таня, мои дочери, никуда из моей жизни, конечно, не исчезали. Самые любимые, дорогие люди. Но железное правило — семья отдельно, работа отдельно — я никогда не нарушал. Не нарушал до весны 1996 года...

У каждого человека свои привычки, свой характер, свой образ жизни. Здесь общих законов нет. Сейчас стало общеизвестным, что Михаил Сергеевич Горбачев от своей жены секретов не держал. И по-своему он был, конечно, прав. У меня была прямо противоположная ситуация: долгие годы в семье я о политике вообще не говорил. Ни слова! Все новости жена и дочери узнавали только по телевизору. Я выслушивал их мнения, восклицания, реплики — и молчал. Со стороны это выглядело, наверное, довольно странно. "Боря, ну сколько же можно не платить пенсии людям! Когда правительство с этим наконец разберется?" Я молчу, как в рот воды набрал. Или отвечаю вроде бы невпопад: "Слушайте, а какая погода сегодня отличная!" Мои мнения о людях, о ситуациях они вычисляли по каким-то словечкам, жестам, реакциям. Так продолжалось долгие годы: читать длинные и сложные лекции о политике я отказывался, а разговаривать на поверхностном уровне — не хотел. Но в момент жесточайшего политического кризиса, когда от меня отвернулись почти все бывшие союзники, семья неожиданно пришла мне на помощь. Пришла в лице дочери.

...Таня была абсолютным технарем, ни о какой политике не помышляла. Ей к тому времени было уже за тридцать. Самостоятельный, сложившийся человек. Окончила факультет вычислительной математики и кибернетики МГУ, уже довольно долго работала в КБ "Салют", была хорошим программистом, занималась баллистикой, в частности расчетом траекторий космических летательных аппаратов. На мою бурную политическую карьеру смотрела, как мне всегда казалось, с уважением и, наверное, с некоторым восторгом, испугом, жалостью: папа, куда же тебя занесло?

И в личной жизни у Тани все сложилось. Ее муж, Алексей Дьяченко, конструктор и сын конструктора, работал в том же бюро. Сын Борька был уже старшеклассником, младший сын Глеб только что родился. Таня как раз была в отпуске по уходу за ребенком, растила маленького Глеба.

...А вначале января я объявил о своем решении идти на выборы. Тогда же был создан мой предвыборный штаб, руководителем которого стал Сосковец. Я рассуждал так: если у Олега Николаевича есть политические амбиции, пусть он их проявит. Пусть покажет, какой он политик, какой политической волей обладает. А там посмотрим...

Скандалы в штабе начались почти сразу же. Первый с подписями по поддержке кандидата в президенты, необходимыми по Закону о выборах. Газеты мгновенно разнесли весть о том, что в день зарплаты железнодорожников и металлургов заставили расписываться сразу в двух ведомостях: в одной — за зарплату; в другой — за президента Ельцина. Я попросил проверить. Оказалось — правда. Это был не только позор на весь мир. Важно было другое — руководитель штаба просто "забыл" о том, что мы живем уже в другой стране.

Это сейчас мы произносим как само собой разумеющееся: политическое планирование, предвыборные технологии. До таких тонкостей тогда не доходили. Шла сплошная, беспардонная накачка губернаторов: вы должны, вы обязаны обеспечить! Серые от испуга губернаторы встречали, рапортовали, но что толку! Ни внятных лозунгов, ни внятной стратегии, ни анализа ситуации не было и в помине. Помню, как Сосковец по какому-то незначительному поводу грубо наорал на телевизионщиков: что-то там не то показали в выпуске "Вестей". Практически поссорил нас с тележурналистами.

Это был единый стиль.

Такая работа живо напомнила мне заседания бюро обкома партии — те же методы, слова, отношения, как будто из глубокого прошлого. В кулуарах вроде бы нормальные живые люди, на заседаниях — наглухо застегнутые "пиджаки".

Тогда-то я и понял, что мне в штабе нужен свой человек. Человек, который беспристрастно и честно сможет рассказать мне о том, что происходит, поможет увидеть ситуацию другими глазами. И самое главное — он должен быть свободен от групповых пристрастий, быть вне борьбы различных "интересов", которыми полна вся эта предвыборная деятельность.

Где же его взять? Да еще такого, который не вызвал бы подозрений, интриг, вошел бы туда спокойно и незаметно. Практически человек-невидимка!

Как-то раз ко мне в Барвиху приехал Валентин Юмашев. Я не выдержал и поделился с ним своими мыслями: чувствую, что процесс не контролирую, вижу по потухшим глазам помощников, в частности Виктора Илюшина, что ситуация в штабе день ото дня ухудшается и мы медленно, но верно погружаемся в болото. И судя по всему, штаб — сплошная склока, никакой стратегии нет, советский стиль общения, на собрание единомышленников совсем не похож.

"Нужен свой человек в штабе", — сказал я. Валентин послушал, покивал, задумался.

...Но кто? Кто это может быть?

"А если Таня?" — вдруг спросил он.

Я вначале даже не понял, о ком он говорит. При чем тут Таня? Это было настолько непривычно, что меня сразу же одолели сомнения: как это будет воспринято в обществе? Что скажут журналисты, политики? Как она будет встречена в Кремле?

...С другой стороны, Таня — единственный человек, который сможет донести до меня всю информацию. Ей скажут то, чего не говорят мне в глаза. А она человек честный, без чиновничьих комплексов, скрывать ничего не будет. Она молодая, умная, она моя дочь, с моим характером. С моим отношением к жизни.

В середине марта создан новый предвыборный совет — его возглавил я сам, а замом стал Виктор Черномырдин. На заседании не без волнения представил Таню: "Представляю вам нового члена предвыборного штаба Татьяну Дьяченко".

Вначале никто ничего не понял: ну, появилось новое лицо, ну, сидит девушка допоздна, появляется рано утром, днюет и ночует на этих совещаниях, общается со всеми, задают наивные вопросы. Может, причуда просто такая? И вдруг в какой-то момент стало понятно: при ней многое стало невозможным. Интриги, склоки мужская борьба самолюбий вдруг улетучились сами собой. Мне об этом рассказали только потом, сам-то я на все эти бесконечные совещания не ходил.

Дело в том, что Таня пришла в этот кремлевский мир из другой жизни. Ее простые, естественные реакции сбивали с толу видавших виды чиновников. Она спрашивала: а почему? И глупость, прикрытая бюрократическим апломбом, мгновенно себя обнажала. И проблема приобретала совершенно ясные очертания.

На некоторых совещаниях Таня совершенно в открытую, не стесняясь, говорила вещи, которые просто шокировали аудиторию: "Слушайте, кого мы выбираем?! Почему папа встречается только с начальниками? Что, нормальных людей вокруг нет? Это же ни в какие ворота не лезет..."

Что чувствует отец взрослой дочери, когда она стала окончательно взрослой? Это очень сложно выразить словами. Это какая-то другая любовь, не менее сильная, чем та, которую испытываешь, когда она еще малыш, ребенок, подросток, девушка, молодая мама. На всех этапах по-разному. А тут... какое-то удивительное чувство покоя. Открываешь во взрослой дочери и потрясающее женское обаяние, и мягкость, и ум, и тонкость. В то же время с некоторым удивлением обнаруживаешь в ней свои черты. И при всем этом она тот человек, который может сказать тебе, порой даже резко, всю правду.

Разумеется, понимание этого пришло далеко не сразу. А сначала были одни чувства. Противоречивые чувства. Но чаще очень хорошие. Таня теперь была все время где-то рядом. Насколько спокойнее я стал себя ощущать!.. Подойдет, поправит галстук, застегнет пуговицу на рубашке — и у меня настроение улучшается. А психологический тонус для кандидата в президенты — вещь абсолютно неоценимая. И еще. До того как Таня пришла в штаб, я думал, что нагрузок, которые обещала предвыборная гонка, просто не выдержу. Физически. Все эти поездки, выступления заранее вызывали у меня стресс. Ведь сорвусь, слягу. Что делать?

А тут я вдруг стал думать: нет, не сорвусь. Смогу. Но самое главное — совершенно естественно стали разрешаться, казалось бы, неразрешимые проблемы.

Примерно в это время я встретился в Кремле с руководителями крупнейших банковских и медиагрупп: с Гусинским, Ходорковским, Потаниным, Березовским, Фридманом и другими известными бизнесменами... Это была первая моя встреча с представителями российского бизнеса в таком составе.

Она состоялась по их инициативе, к которой я поначалу отнесся довольно сдержанно. Понимал, что деваться им некуда, все равно будут меня поддерживать, и думал, что речь пойдет, видимо, о финансировании моей предвыборной кампании. Но речь пошла совсем о другом. "Борис Николаевич, то, что происходит в ваше предвыборном штабе во главе с Сосковцом, в вашем окружении, — это уже почти крах. Именно эта ситуация заставляет одних бизнесменов идти договариваться с коммунистами, других — упаковывать чемоданы. Нам договариваться не с кем. Нас коммунисты на столбах повесят. Если сейчас кардинально не переломить ситуацию, через месяц будет поздно".

Такого жестокого разговора я, конечно, не ожидал. Больше того, этим дело не ограничилось: они предложили использовать в предвыборной кампании весь их ресурс — информационный, региональный, финансовый, но самое главное — человеческий. Они рекомендовали в штаб своих лучших людей. Тогда и появилась так называемая аналитическая группа, куда вошли Игорь Малашенко, Сергей Зверев, Василий Шахновский, независимый социолог Александр Ослон и другие молодые, сильные аналитики.

(Продолжение на 4-й стр.)

Міхась ДАНІЛЕНКА

Апавяданні пра рэчы

Рыдлёўка

У гэтых мясцінах рыдлёўку яшчэ называюць заступам, лапатай. Лязо ў той, што адзінока стаяла каля сянец пакінутай хаты, было злізана. Метал пакрысе пакрывала карычневая ржа. Дзіва што: рыдлёўкай які ўжо час не карысталіся. А бывалі ж і для яе лепшыя часіны.

Звычайна, калі ў вясновых палях пачынаўся грачыны грай, а з выраю вярталіся буслы і пліскі, гаспадар выходзіў на падворак. Падстаўляў сонцу твар, распраўляў плечы і гаварыў жонцы:

— Пайду ўскапаю градку пад раннюю бульбу.

Браў рыдлёўку (яна перажывала зіму ў дрывотні пад страхой) і ішоў у агарод. Асцярожна, але на поўны "штык" усаджваў у падатлівую зямлю. Раз — нагінаўся, два — адварочваў тлустую скібу, тры — пераварочваў яе перад сабой. Прыемна ныла спіна. Ззаду ўсё больш і больш заставалася ўскапанай зямлі. На лбе выступаў пот. Чалавек спыняўся. Падымаў галаву, удыхаў на поўныя грудзі водарны пах вясны. Слухаў, як з вышыні неба падаваў голас першы вясновы вястун — жаваранак. Дзе ён там? А — вунь! Ледзь прыкметная кропка трапечацца над зямлёй.

Дзяржак рыдлёўкі змайстраваў сам гаспадар. Доўга габляваў шклом ад разбітай бутэлькі. А потым яшчэ праціраў наждачнай паперай. Урэшце і ад яго працавітых далоняў той дзяржак ледзь не ззяў...

А потым гаспадара не стала. Апошнюю яму дамоўку два бамжы з гэтай вёскі, што тулілася ў чарнобыльскай зоне, капалі гэтай жа рыдлёўкай.

— Глядзі, якая вострая, — дзівіўся адзін, твар якога густа пакрыла чорная шчасціна.

— Мо на тачыле адточваў?

— Дзе тое тачыла? — хмыкнуў першы. — Калі б было, даўно сцягнулі б.

Апошнюю сваю службу гаспадару рыдлёўка саслужыла спраўна. Цяпер яна, забытая, стаяла ля сцяны сянец. Пакрысе ржавела. Не ведала, што ў адзін з летніх дзён, калі сюды па лісічкі наведаюцца тыя п'яніцы, што некалі капалі магілу, прыхопяць і яе. Не прападаць жа дабру...

Ватоўка

Яна вісіць забытая ў кладоўцы на заржавелым цвіку. Левае крысо ватоўкі нават пакрылася зеленаватай плесенню: сюды даўнавата не зазіраў гаспадар. А вільчык будынка крыху працякае: дошкі на самым вільчыку прагнілі. Калі церусіць безупынны дождж, вадзяныя струменьчыкі па дахавым насціле, як па жолабе, сцякаюць на сцяну, дзе вісіць фуфайка.

Адно крысо ў гэтай непрыглядная вопратцы залаплена вялікай сіняй латкаю. Некалі гаспадар вясною вырашыў на сваёй мяжы "пусціць пал". Трава тут за апошнія гады вымахала ледзь не ў чалавечы рост. Яна перашкаджала расці новай парослі. Неяк выдалася ціхая раніца. Не чуваць было нават подыху ветрыку. Чалавек дастаў з кішэні ватоўкі карабок і чыркнуў запалкай. Маленькі язычок полымя прабег па сухой сцяблінцы. Мятліца захісталася і ніцма легла перад агеньчыкам. А ён — пакуль нясмелы — перабраўся да чарговай кучкі пажарніцы. І раптам палыхнула так, што чалавек адступіўся ад полымя на некалькі крокаў назад. Між тым падзьмуў вецер, і агнявы вал пакаціўся ў бок вёскі.

— Агонь! Дапамажыце! — крыкнуў чалавек.

Але яго ніхто не чуў. Раптам ён убачыў, як з хаты бегла з рыдлёўкай яму на дапамогу жонка. Цяпер усё вырашалі секунды. Не раздумваючы, чалавек скінуў фуфайку і пачаў тушыць полымя, што паўзло па мяжы.

— А божачкі! — лямантавала жонка і гупала рыдлёўкай па затлелай траве. — Трэба ж было табе, старому дурню, падпальваць у такую суш...

Чалавек вінавата маўчаў. Вечарам жонка прыладжвала вялікую сінюю латку на спаленае крысо. Яе чуйныя пальцы нешта намацалі ў ваце пад падкладкай.

— А ну, дай я гляну, — раптам захваляваўся муж.

Ён падхапіўся з табурэткі. Але жонка паспела нажніцамі распароць шво. На далонь высмаргнула некалькі шрацінак.

— Глядзі ты, — нібы толькі цяпер іх разгледзеў гаспадар.

Ён утоіў ад жонкі, што некалькі дзён назад у лесе пайшоў бяззбройны на браканьера. Той свежаваў тушу казулі. Калі егер дастаў паперы, каб скласці акт, браканьер здалёку смальнуў са стрэльбы. Праўда, не пацэліў. Але некалькі шрацін трапілі ў ватоўку. Тут і заселі.

— Бач ты. Выратавала, — пагладжваючы зашмальцаваны верх адзежыны, прагаварыў гаспадар.

...Цяпер няма ўжо на свеце і гаспадара ватоўкі. А яна, забытая, вісіць у кладоўцы. І дожджык на яе пырскае. Браканьер жа, які некалі падстрэліў бяскрыўдную жывёліну ў пушчы, мусіць, вывіжоўвае новую ахвяру...

Гумовыя боты

З-за гэтых гумовых ботаў у Івана і Мар'і заўсёды справа даходзіла ледзь не да сваркі.

— Прыбяры ты, Іване, іх адсюль, з веранды! — звычайна бурчэла Мар'я. — Яна размахвала вехцем, якім шаравала масніцы. Босыя ногі жанчыны моцна стаялі на падлозе.

А Іван — дробненькі, падобны нечым на маладога шпачка, браў боты за халявы і нёс на ганак. Там, дзе ён іх пакідаў, праз нейкі час наплывала лужына мутнай вады.

Звычайны абутак для вясковых жыхароў — гумовыя боты. У чым можна выйсці ў дажджлівую вясну ці хмурую восень на вуліцу? Вядома, толькі ў гумовіках. А калі ведаць, што Іван — пастух, дык у тых ботах ён соўгаўся за статкам лічы да першых дзён, калі мароз скоўваў зямлю.

Ды гумовікі, як вядома, не вечныя.

— Раней, — разважаў услых Іван, каб чула і жонка, — хоць гуму давалі лепшую. Памятаеш, некалі я купіў літыя? Ім зносу не было. А гэтыя...

— Маўчы ўжо, пачаў сваю анцімонію разводзіць. Вунь клей. Вунь — гума. Садзіся і латай!

Для Івана пачыналася бясконцая работа. Ён браў напільнік, шараваў па кавалачку гумы, якую збіраўся наклеіць на дзіравае месца. Бутэлечку клею, што з горада некалі прывёз сын, Іван бярог, як нешта дарагое. Але зноў жа, ці той "Момант" быў выпушчаны даўно, ці, мо, пад вядомую марку прахіндзеі, якіх за апошнія гады развялося, як мух, выпускалі нягодную прадукцыю, клей рэдка калі добра схопліваў парваны бот. Вунь на галяніўчы ззаду зноў зеўрае вялікая трэшчына.

Іван цяжка ўздыхае, разгладжвае наклейку, якую прымерваецца шлёпнуць на бот, і задумваецца.

Гэта колькі ж гадоў пасе ён гавяду? Нямала. Былі часы, калі пастухам нават выдавалі транзістары. Пачэпіш на шыю і цягаешся за статкам. Потым увялі так званыя электрапастухі. Але трансфарматары ад іх увішныя дзяцюкі хутка папрадавалі, кажуць, аж у Польшчу. Хадавым, значыць, аказаўся тавар. Адмовіўся Іван і ад каня. Два яго напарнікі пасуць вярхом, а ён паціху тупае ў сваіх ботах за каровамі.

— Эха-ха! — уздыхае Іван і крычыць Мар'і. — Ці дашлэпаю, жонка, у іх хоць да пенсіі?

Спорт

Канвеер тэнісных сенсацый


Яўген Кафельнікаў.

